Сучасны рытм жыцця хутка павялічвае аб'ём інфармацыі, таму сёння СМІ разглядаюцца як адзін з фактараў, што садзейнічае фарміраванню светапогляду чалавека, маральнаму сталенню асобы і яе пагружэнню ў соцыум, грамадскае жыццё краіны і свету. Гімназічныя СМІ выступаюць дзейсным інструментам грамадскага кіравання развіццём установы праз стварэнне ўмоў для праяўлення педагагічнай, бацькоўскай і вучнёўскай ініцыятывы.

# Спачатку быў «ПАchatАК»

## Фарміраванне інфармацыйнай адукаванасці вучняў праз выкарыстанне патэнцыялу гімназічных сродкаў масавай інфармацыі



**Ірына Міхайлаўна Рыбакова,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі ДУА «Гімназія № 10 г. Маладзечна». Педагагічны стаж — 35 гадоў.

Медыйныя платформы, створаныя з мэтай творчай самарэалізацыі членаў гімназічнай супольнасці, садзейнічаюць сацыяльнаму станаўленню школьнікаў. Падлеткі заўсёды імкнуцца пашырыць зносіны, таму яны ствараюць групы па інтарэсах для абмену думкамі, уражаннямі, маюць старонкі ў сацыяльных сетках. Агульнае жаданне вучняў і кіраўніцтва гімназіі мець сродак масавай інфармацыі ажыццявілася ў снежні 2011 г., калі дзякуючы намаганням групы адзінаццацікласнікаў пад маім кіраўніцтвам выйшаў першы нумар газеты «ПАchatАК». Выпуск горача падтрымала дырэктар гімназіі Таццяна Генадзьеўна Камкова. За дзесяцігоддзе выданне не толькі стала камунікатыўнай пляцоўкай, але і летапісам навучальнай установы. Нездарма дэвізам выдання выбраны лацінскі афарызм «Сеяць разумнае, добрае, вечнае». Удзел у стварэнні газеты дапамагае вучням рэалізаваць творчыя здольнасці, удасканаліць веды па рускай і беларускай мовах, паспрабаваць сябе ў журналістыцы, а камусьці і вызначыцца з выбарам прафесіі.

«ПАchatАК» выдаецца адзін раз на навучальную чвэрць. Свет пабачылі ўжо 46 нумароў. Артыкулы, інтэрв'ю, эсэ, замалёўкі, вершы, крыжаванкі, аўтары якіх вучні, настаўнікі, бацькі гімназістаў, ветэраны працы, друкуюцца на беларускай ці рускай мовах. Праца ў камандзе часам складаная, але цікавая, бо заўсёды гэта партнёрская падтрымка, гумар, узаемаабмен і ўзаемаўзбагачэнне. Цудоўна, калі з калегамі па пяры супадаюць мэты і каштоўнасці, завязваецца сяброўства. Асабліва гэта адчуваецца ва ўзаемаадносінах з навучэнцамі. Без іх удзелу мы, дарослыя, не змаглі б зрабіць дзіцячую газету цікавай і разнастайнай па змесце. У склад рэдкалегіі ўваходзяць рэдактары І. Рыбакова, Т. Чаеўская, мастак А. Сербіна, юнкары Ульяна Рабая, Марыя Ракецкая, Маргарыта Падалян, Марыя Абановіч. Вярстальнік адзінаццацікласнік Павел Шаюк працуе ў праграмах Adobe inDesign, Photoshop. У гэтым навучальным годзе ён рыхтуе сабе змену — дзевяцікласнікаў Данііла Данкевіча, Арсенія Буценя, Мікіту Шаўроўскага.

Выданне газеты — справа агульная: для паспяховага развіцця выдавецкай справы рэдакцыя і кіраўніцтва гімназіі аб'ядналі намаганні. Без дапамогі дарослых юнкары наўрад ці змогуць арганізаваць рэгулярны выпуск газеты, сабраць, абагульніць і прааналізаваць інфармацыю, звярстаць нумар. Памочнікамі і дарадцамі

ЧИТАЙТЕ В СВЕЖЕМ НОМЕРЕ «ОМ»